Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛІСТАПАДА 2017 г. ПЯТНІЦА №213 (28577)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Таленты краіны»... Адкрываем разам!

СТАР. 5



Кожны носіць з сабой свае… Шпількі

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

## Служыць высокім ідэалам

**Удзельнікам і гасцям XXIV Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»**

Дарагія сябры! Вітаю вас на адкрыцці XXIV Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Дэвіз цяперашняга фестывалю — «Ісціна. Любоў і прыгажосць» — вельмі добра адлюстроўвае яго пачэсную місію: служыць высокім маральным і эстэтычным ідэалам, зберагаць і памнажаць лепшыя дасягненні нацыянальнага і сусветнага кінематографа.

Творчая гісторыя мінскага форуму — гэта сотні запамінальных кінапрэм'ер, мноства сустрэч з прызнанымі майстрамі экрана, адкрыццё яркіх маладых талентаў, шырокая панарама ўнікальных і цікавых праектаў.

Упэўнены, што «Лістапад» стане значнай падзеяй гэтага года і будзе спрыяць умацаванню дружбы паміж народамі.

Жадаю ўдзельнікам фестывалю творчага натхнення, міру і дабрабыту, а яго гасцям — прыемных уражанняў і цёплых сустрэч!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

## Крыніца духоўнасці і натхнення

**Удзельнікам урачыстасцяў з нагоды 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа**

Дарагія сябры! Сардэчна віншую вас са 135-годдзем з дня нараджэння славутага пісьменніка, народнага паэта Беларусі, класіка нацыянальнай і сусветнай літаратуры Якуба Коласа.

Адзін з заснавальнікаў сучаснай мастацкай прозы, аўтар знакамітых паэтычных шэдэўраў, ён стаў сапраўдным народным песняром, сімвалам велічы і культурнага багацця нацыі. Таленавіты майстар слова адлюстраваў у сваіх творах самыя высокія чалавечыя пачуцці, мудрасць і найлепшыя рысы характару беларусаў, шчырую любоў да роднай мовы. Жыццё і літаратурная дзейнасць нашага выдатнага земляка — прыклад самаадданага служэння народу і Айчыне. А яго творчая спадчына па праве лічыцца крыніцай духоўнасці і натхнення для многіх пісьменнікаў.

Упэўнены, урачыстыя мерапрыемствы будуць спрыяць захаванню, развіццю і папулярызацыі нацыянальнай культуры, умацаванню еднасці грамадства і ўслаўленню новых яркіх літаратурных талентаў.

Жадаю ўсім поспехаў, міру і дабрабыту!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

# САБАЛЯНЕ ЯСНЫЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Уладзімір і Нэлі ЯСНЫЯ жывуць у шлюбе ўжо 51 год. Выгадавалі чацвёра дзяцей, якія падаліся ў гарады, а самі працягваюць жыць у вёсцы Сабалі Чашніцкага раёна. Акрамя Уладзіміра Іосіфавіча і Нэлі Сямёнаўны, у Сабалях жывуць яшчэ 17 жыхароў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Восем з дзесяці дакументаў па лібералізацыі бізнесу падпісаны. У найбліжэйшы час будзе падпісаны дакумент па лічбавізацыі эканомікі, па Парку высокіх тэхналогій. Ён практычна гатовы. Мяркуецца, што пасля прыняцця ўсяго пакета дакументаў будзе праведзена шырокае грамадскае абмеркаванне гэтых навацый. Пакет дакументаў, накіраваных на развіццё прадпрымальніцтва, павінен кардынальна памяняць бізнес-асяроддзе ў краіне. Гэтыя крокі накіраваны на вырашэнне дзвюх асноўных задач: забеспячэнне самазанятасці насельніцтва, зніжэнне кошту ўваходжання ў любы бізнес і наступнага адміністравання, а таксама лічбавізацыі эканомікі».*

■ Жыллё мае

# ХАУС-МАЙСТАР: спецыяліст па доме ці яго кіраўнік?

### Можа лямпачку памяняць, аднак у электрашчыток лезці не павінен

**Практыка замацавання за адным чалавекам догляду і абслугоўвання некалькіх дамоў прыйшла да нас з Германіі, але ў айчынным выкананні праца хаус-майстра адрозніваецца ад нямецкай і выкарыстоўваецца не ў поўнай меры. Таму патрабуе ўдасканалення, у тым ліку і праз змену заканадаўчых нормаў.**

### Абавязкі па тэхналагічнай карце

У Беларусі хаус-майстар — гэта рабочы па комплексным абслугоўванні дамоў і будынкаў, а ў Германіі яго абавязкі больш шырокія. Нашага хаус-майстра жыхары могуць і не бачыць, калі ўсё дасканала працуе, аднак пры гэтым на ім вялікая адказнасць, бо ён здзяйсняе кантроль за тэхнічным станам дома, работай электраабсталявання, аглядае пад'езды, падвалы, сочыць за захаваннем жылфонду.

СТАР. 3

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9774 | ▲ |
| Еўра | 2,3027 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0340 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0734 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# РАЗЛІК НА РЭГІЁНЫ

## Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з украінскім калегам

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў учора сустрэчу з кіраўніком Украіны Пятром Парашэнкам у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Нагадаем, Аляксандр Лукашэнка наведвае Эміраты з рабочым візітам. Як паведаміла прэс-служба беларускага лідара, падчас паездкі запланаваны перагаворы з кіраўніцтвам краіны, а таксама шэраг сустрэч з прадстаўнікамі бізнес-колаў.**

З працоўным візітам у ААЭ 1—2 лістапада знаходзіўся і Пётр Парашэнка. Напярэдадні ён здзейсніў афіцыйны візіт у Саудаўскую Аравію.

«У гандлёва-эканамічных адносінах мы вельмі актыўна супрацоўнічаем. Наш тавараабарот ужо, нягледзячы на рознага роду праблемы і перашкоды, склаў больш як $3 млрд, напэўна, недзе $3,5 млрд будзе на сённяшні дзень. Але ў нас ёсць вельмі добрая магчымасць пашырыць супрацоўніцтва за кошт узаемадзеяння рэгіёнаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Новы імпульс развіццю адносін паміж краінамі, упэўнены беларускі лідар, дасць першы форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны, які рыхтуецца правесці ў Гомелі.

«Што да палітычнага ўзаемадзеяння, то ў нас увогуле праблем няма. Мы абсалютна ідзём па тым курсе, па якім дамовіліся ісці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што нават на вялікай адлегласці ад сваіх краін прэзідэнты змаглі сустрэцца і разгледзець праблематыку адносін. «Сёння ў нас ёсць магчымасць абмеркаваць тыя пытанні, якія маюць патрэбу ў дадатковым імпульсе. Я хачу вас запэўніць, што мы заўсёды былі людзьмі спраўнымі: калі мы абяцаем, мы гэта робім. Я хачу гэта вам гарантаваць і на будучыню», — звярнуўся кіраўнік нашай краіны да свайго ўкраінскага калегі.

Пётр Парашэнка адзначыў актыўную працу над рэалізацыяй раней дасягнутых дамоўленасцяў, пачынаючы ад пытанняў дэмаркацыі і заканчваючы гандлёва-эканамічным супрацоўніцтвам. «Я гэтае пытанне трымаю на кантролі», — падкрэсліў Прэзідэнт Украіны. Ён выказаў задавальненне ў сувязі з тым, што бакі пашыраюць узаемадзеянне па розных напрамках, уключаючы эканоміку і сацыяльную сферу.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Ад простага гандлю да прамысловай кааперацыі

**Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў і прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў учора на сустрэчы ў Ташкенце абмяркавалі пашырэнне беларуска-ўзбекскага супрацоўніцтва ў розных сферах.**

На сустрэчы быў абмеркаваны ход падрыхтоўкі да візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан. Як паведамляе БЕЛТА, размова таксама ішла аб арганізацыі чарговага пасяджэння двухбаковай міжурадавай камісіі. Плануецца, што пасяджэнне пройдзе ў Мінску, дата будзе дадаткова ўзгоднена. На ім мяркуецца адпрацаваць пытанні, якія пазначылі кіраўнікі дзвюх краін падчас візіту Прэзідэнта Беларусі ва Узбекістан у 2016 годзе. Міжурадкамісія зацвердзіць дарожную карту гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, падрыхтоўка якой знаходзіцца ўжо на фінальнай стадыі. Беларусь таксама прапанавала ўзбекскаму боку падпісаць новы дагавор аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.

Андрэй Кабякоў і Шаўкат Мірзіёеў абмеркавалі канкрэтныя праекты ў прамысловай кааперацыі, прыцягненне інвестыцый.

Ва Узбекістане адкрыта прадстаўніцтва «Амкадора». Створана вытворчасць трактароў, у гэтым годзе з беларускіх машынакамплектаў ужо сабрана 150 адзінак і Беларусь разлічвае на пашырэнне гэтага супрацоўніцтва. Такім чынам, бакі адыходзяць ад простага гандлю і развіваюць прамысловую кааперацыю. Ва Узбекістане зарэгістраваны 23 беларускія арганізацыі і два суб'екты тавараправоднай сеткі. Узбекістанам прынята рашэнне аб заснаванні пасольства краіны ў Мінску, у найбліжэйшы час чакаецца прызначэнне пасла.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Эканамікс

# АМБІЦЫЙНЫЯ ПЛАНЫ НА КУБЕ

## Нашы прадпрыемствы ўдзельнічаюць у адной з найбуйнейшых выставак Лацінскай Амерыкі

**Нацыянальная экспазіцыя нашай краіны прадстаўлена на Міжнароднай выстаўцы «FIHAV» на Кубе. Па сваёй значнасці гэта выстаўка ўваходзіць у тройку найбуйнейшых выставачных мерапрыемстваў у Лацінскай Амерыцы. Штогод у мерапрыемстве прымаюць удзел больш за чатыры тысячы кампаній з 60 краін.**

У цырымоніі яе адкрыцця прынялі ўдзел міністр прамысловасці Віталь Воўк і пасол Беларусі на Кубе Аляксандр Аляксандраў.

Як адзначыў у сваім выступленні Віталь Воўк, мэта ўдзелу ў выстаўцы — гэта новыя кантакты і новыя партнёры. А галоўная мэта для прамысловасці Беларусі — больш актыўна ўваходзіць на рынак Кубы. «Для гэтага ёсць усе перадумовы, — адзначыў міністр. — За апошні час з'явіліся новыя партнёры, новыя механізмы. З улікам устаноўкі кіраўніка дзяржавы на цесную працу з Кубай, я ўпэўнены, што мы рэалізуем гэтыя амбіцыйныя планы. У найбольшай ступені для гэтага рынку цікавая тэхніка МАЗа, «Амкадора», МТЗ, разлічваем на тэхніку «Гомсельмаша». Наогул, уся прадукцыя, якая сёння выпрабляецца ў Рэспубліцы Беларусь, можа быць запатрабавана на кубінскім рынку».

Падчас цырымоніі адкрыцця было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і Гандлёвай палатай Рэспублікі Куба.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ЯК ЗРАБІЦЬ ЭКАНОМІКУ ЎСТОЙЛІВАЙ?

**У сталіцы стартаваў «Кастрычніцкі эканамічны форум «Аснова будучыні». Дадзеная дыялогавая пляцоўка стала ўжо традыцыйнай для экспертаў і эканамістаў, якія абмяркоўваюць устойлівае развіццё Беларусі ў кантэксце працэсаў глабальнай эканомікі. Першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль МАЦЮШЭЎСКІ адзначыў, што ва ўрадзе краіны ўважліва слухаюць экспертаў форуму і ўлічваюць іх рэкамендацыі.**

Васіль Мацюшэўскі запэўніў, што Беларусь удзяляе асаблівую ўвагу вызначэнню ключавых кірункаў далейшага ўстойлівага эканамічнага развіцця. Таксама ён выказаў надзею, што форум — добрая нагода пазначыць механізмы дасягнення пастаўленых мэт па стварэнні новых драйвераў эканамічнага развіцця і шляхоў павышэння якасці жыцця насельніцтва.

Падчас форуму першы віцэ-прэм'ер закрануў пытанні перагавораў з Міжнародным валютным фондам. Па яго словах, у Беларусі няма неабходнасці ў экстранным фінансаванні і крэдыты не з'яўляюцца прыярытэтным пытаннем для краіны: «У нас збалансаваная сітуацыя, мы дастаткова абслугоўваем свае абавязальствы. Нам не патрэбныя дадатковыя грошы. Узаемадзеянне з МВФ — гэта іншая гісторыя. МВФ традыцыйна ўспрымаецца інвестарамі, удзельнікамі рынку як глабальны аўдытар. Нам проста патрэбен дыялог з МВФ, каб яны пацвярджалі, што мы рухаемся ў правільным кірунку, што ніякіх пагроз для інвестараў няма. Вось асноўная задача». Чарговае абмеркаванне праграмы з МВФ адбылося напярэдадні.

**Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Андрэа ВІКТАРЫН** у размове з журналістамі нагадала, што ЕС заўсёды дапамагаў і падтрымліваў перагаворны працэс Беларусі з МВФ. «Мы перакананы ў тым, што пагадненне з МВФ значна палепшыць сітуацыю ў беларускай эканоміцы, калі яно будзе дасягнута, а таксама паслужыць пазітыўным сігналам для ўсяго свету. Беларусі важна сфарміраваць станочы імідж і пасылаць правільныя паведамленні міжнароднай інвестыцыйнай супольнасці», — адзначыла Андрэа Віктарын.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Дональд Трамп выступіў за смяротнае пакаранне для падазраванага ў здзяйсненні тэракта ў Нью-Ёрку

Сваё рашэнне кіраўнік Белага дома апублікаваў у асабістым Твітар-акаўнце.

«Нью-ёркскі тэрарыст з захапленнем прасіў павесіць сцяг ІД у сваёй бальнічнай палаце. Ён забіў восем чалавек і цяжка параніў 12. Павінен атрымаць смяротны прысуд!» — адзначыў амерыканскі прэзідэнт.

Нагадаем, што выхадзец з Узбекістана Сайфуло Саіпаў падазраецца ў здзяйсненні 31 кастрычніка тэракта ў нью-ёркскім раёне Манхэтэн.

## Масквічы сталі ў чаргу па iPhone X за тры дні да старту продажаў



Да старту афіцыйных продажаў iPhone X застаюцца яшчэ суткі, але многія масквічы пачалі займаць чаргу па гаджэт яшчэ напярэдадні.

Паводле некаторых даных, у самаарганізаванай чарзе цяпер налічваецца да 300 чалавек.

Халоднае надвор'е нікольκі не бянтэжыць масквічоў. Людзі падрыхтаваліся да шматгадзіннага чакання хто як мог: некаторыя захуталіся ў пледы, іншыя саграваюцца гарачымі напоямі з тэрмасаў, трэція ратуюцца і тым, і іншым, седзячы на раскладных крэслах.

Тым часам у сацсетках актыўна распаўсюджваецца інфармацыя аб тым, як можна зарабіць на чарзе. Так, некаторыя з удзельнікаў непасрэдна ў дзень продажаў, 3 лістапада, плануюць прадаваць свае месцы за 50—60 тысяч расійскіх рублёў.

Нагадаем, што кошт iPhone X у Расіі складзе як мінімум 79 990 расійскіх рублёў.

## Сына кіраўніка МУС Украіны адпусцілі, абавязаўшы насіць электронны бранзалет

Саломенскі раённы суд Кіева адпусціў пад асабістае абавязацельства сына кіраўніка МУС Украіны Арсена Авакава Аляксандра, які абвінавачваецца ў карупцыі пры закупцы рукзакоў для Нацыянальнай гвардыі. Суддзя заявіў, што сын кіраўніка МУС абавязаны прыбыць у следчыя органы па першым жа патрабаванні, а таксама яму неабходна насіць электронны сродак кантролю — бранзалет.

Між тым пракурор настойваў на арышце сына Авакава на 60 сутак з магчымасцю закладу ў 5 млн грыўняў ($185 тыс.). Сам падазраваны паведаміў, што лічыць справу супраць яго «палітычна ангажаванай».

Аляксандра Авакава падазраюць у растраце бюджэтных сродкаў пры закупцы рукзакоў для патрэб МУС. 31 кастрычніка сын кіраўніка МУС быў затрыманы супрацоўнікамі нацыянальнага антыкарупцыйнага бюро. Яму інкрымінуюць карупцыйную схему закупкі партыі рукзакоў для нацгвардыі, што падпарадкоўваецца МУС, якім кіруе яго бацька. Увечары таго ж дня Авакаў-малодшы быў дастаўлены ў ізалятар часовага ўтрымання.

У лютым 2015 года МУС заключыла дагаворы на 17 млн грыўняў ($630 тыс.), а ў чэрвені 2015 года выйшла журналісцкае расследаванне аб тым, што рукзакі былі набыты праз прадпрыемствы, падкантрольныя Авакаву. Міністр унутраных спраў заяўляў, што ні ён, ні яго сын не маюць дачынення да гэтых рукзакоў.

■ Дыялог бізнесаў

# ПАЧУЦЬ ГОЛАС ПРАДПРЫМАЛЬНІКА

## Членам Сусветнай гандлёвай арганізацыі Беларусь можа стаць ужо праз два гады

**Уваходжанне ў СГА дазволіць нашай краіне ўмацаваць імідж і станоўча паўплывае на інвестыцыйны клімат. Разам з тым узрасце праблема балансавання паміж аховай нацыянальных інтарэсаў і адкрытасцю эканомікі. Удзел айчыннага бізнесу ў перагаворным працэсе па далучэнні да Сусветнай гандлёвай арганізацыі павялічыць шанцы на паспяховае вырашэнне падобных выклікаў. Гэта пытанне абмеркавалі ў Беларускай гандлёва-прамысловай палаце са старшынёй рабочай групы па далучэнні Беларусі да СГА — пастаянным прадстаўніком Турцыі пры СГА Кемалем МАДЭНАГЛУ.**

**Старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ** звярнуў увагу, што ў нашай краіне, як і ў многіх развітых дзяржавах свету, надаецца вялікае значэнне развіццю сектара малога і сярэдняга бізнесу. «Для ўсіх эканамічных гульцоў далучэнне да СГА з'яўляецца важнай падзеяй. Мы атрымліваем ад гэтага нямала пазітыўных эфектаў, але таксама з'яўляюцца і новыя выклікі. Можна сказаць, што сёння беларускі бізнес усё яшчэ недастаткова актыўна ўключаны ў працэс абмеркавання далучэння краіны да СГА. Гэтая сустрэча — намер прыцягнуць дзелавыя колы, жаданне пачуць іх голас, даведацца ад працоўнай групы па далучэнні аб складанасцях на гэтым шляху», — растлумачыў Уладзімір Улаховіч сэнс сустрэчы.

Старшыня БелГПП лічыць, што пазітыўныя эфекты для бізнесу ў далучэнні Беларусі да СГА будуць істотныя. «На дзяржаўным узроўні пераадольваюцца колькасныя абмежаванні, разглядаюцца антыдэмпінгавыя справы. Усё гэта адбываецца ў рамках СГА. І пытанні пратэкцыяніцкіх мер, якія могуць працаваць у дачыненні да Беларусі, эфектыўна здымаюцца», — прывёў прыклады Уладзімір Улаховіч.

Таксама ён нагадаў, што Беларусь ужо сёння працуе на прынцыпах СГА — у рамках ЕАЭС. «Казахстан, Кыргызстан, Арменія, Расія — члены СГА. Нам трэба гэты працэс фармалізаваць. Бізнес павінен атрымаць прэферэнцыі ў зніжэнні бар'ераў, але, з іншага боку, ён павінен прыняць гэты выклік і павысіць якасць сваёй прадукцыі і паслуг па канкурэнтнай цане. Гэта будзе іспытам для нашай лёгкай прамысловасці, машынабудавання, сельскай гаспадаркі... Практычна ўсе краіны, якія далучыліся, уводзілі пераходны перыяд і дамаўляліся пра пэўныя інструменты падтрымкі сельскай гаспадаркі. Тое самае будзе датычыцца і бізнесу. На гэтых перагаворах будуць абмяркоўваца пытанні падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Гэта важны эканамічны гулец, што разумеюць і ва ўрадзе, і на перагаворах, якія праходзяць у рамках СГА. Без голасу бізнесу працэс уваходжання немагчыма праводзіць», — рэзюмаваў Уладзімір Улаховіч.

Кемаль Мадэнаглу паведаміў журналістам, што працэс далучэння Беларусі да СГА ідзе добра. «Гэта адбываецца з улікам высокай увагі Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Усе дзяржаўныя структуры, уключаючы міжведамасную камісію, міністэрствы, працуюць старанна. Вынік будзе відаць у хуткай будучыні ў Жэневе. Калі зацікаўленасць беларускіх структур ва ўступленне ў СГА будзе ўстойлівай, то, магчыма, праз два гады гэта адбудзецца», — лічыць старшыня рабочай групы. Пры гэтым ён падкрэсліў, што члены СГА зацікаўлены ў тым, каб беларускі бок добра разумеў патрабаванні і правілы ўнутры арганізацыі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

# БАБІНА ЛЕТА?

## Сіноптыкі абяцаюць у нядзелю і панядзелак да плюс 12 °С

**У гэтыя выхадныя чакаецца цёплае, пераважна без ападкаў надвор'е, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння раніцай атмасферныя франты прынясуць дажджы на большую частку тэрыторыі краіны. Днём франты пакінуць Беларусь, але ў асобных раёнах яшчэ не абыдзецца без невялікіх дажджоў. Месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўдзень будзе ад плюс 4 да плюс 10 градусаў. У суботу і нядзелю надвор'е на тэрыторыі Беларусі абумовіць зона павышанага атмасфернага ціску, будзе цёпла, пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі чакаецца туман, магчымы слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў. У суботу ўдзень будзе 4—10 цяпла, у нядзелю — ад плюс 6 да плюс 12 градусаў.

У панядзелак і аўторак наша краіна апынецца пад уплывам малаактыўнага атмасфернага фронту, які перамяшчаецца з боку Балтыйскага мора. У панядзелак у асобных раёнах, пераважна на захадзе краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай на ўсходзе Беларусі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 цяпла, па ўсходзе пры праясненнях яна панізіцца да нуля — мінус 1 градуса. Удзень сонейка разагрэе паветра да плюс 6 — плюс 12 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ На слыху

# «ТАМ СТРАШНА І НЕБЯСПЕЧНА»...

**У Магілёве распачата крымінальная справа ў адносінах да прадпрымальніка, у недабудаваным доме якога пацярпелі дзеці.**

У магілёўскай 45-й сярэдняй школе жалоба. Страшная трагедыя, якая здарылася 1 лістапада ў мікрараёне Спадарожнік, забрала жыццё аднаго вучня 4 «К» класа і яшчэ аднаго з надзвычай цяжкімі траўмамі прыкавала да бальнічнага ложка. Як мы ўжо пісалі, у сераду каля чатырох гадзін вечара ў мікрараёне Спадарожнік па вуліцы Загарадная шаша абрынулася перакрыццё пустуючага дома, дзе гулялі двое дзяцей 2007 і 2008 гадоў нараджэння. Адно з іх загінула, за жыццё яго аднакласніка сёння змагаюцца ўрачы абласной дзіцячай бальніцы. Яны аднавілі сэрцабіцце, але на раніцу ўчарашняга дня хлопчык быў у непрытомнасці.

— Стан яго вельмі цяжкі, без дынамікі, — паведаміў **галоўны ўрач гэтай бальніцы Ігар КАСКО.** — Ён у коме. Цяжкае прыгнечанне свядомасці, усе функцыі арганізма падтрымліваюцца медыцынскім шляхам. Медыкаменты трымаюць артэрыяльны ціск, прымушаюць біцца сэрца, апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх дыхае замест яго — дзіця на поўным замяшчэнні функцый арганізма.

Медыкі пакуль не даюць ніякіх прагнозаў. Усю ноч побач з хлопчыкам былі яго бацькі і родныя.

Следчы камітэт па Магілёўскай вобласці працуе над расследаваннем гэтай трагічнай справы.

— Хлопчыкі, якія пацярпелі, прыйшлі ў госці да свайго сябра 2010 года нараджэння, — расказала **афіцыйны прадстаўнік УСК па Магілёўскай вобласці Аксана САЛЯНЮК.** — Калі дзеці сабраліся ісці, яны паклікалі хлопчыка з сабой пагуляць у закінутым доме. Але той адмовіўся, растлумачыўшы, што маці не дазваляе яму гэтага рабіць. Маўляў, дом недабудаваны, там страшна і небяспечна. Яго таварышы пайшлі, а хлопчык стаў назіраць за імі. Пліта перакрыцця абвалілася, калі малыя пералазілі цераз аконны праём. Малы адразу ж кінуўся да дарослых, каб папярэдзіць аб няшчасці. Яны і патэлефанавалі ратавальнікам.

З дапамогай гідраўлічнага аварыйна-ратавальнага абсталявання супрацоўнікі МНС дасталі з-пад пліты целы хлопчыкаў. Аднаму з іх ужо нічым нельга было дапамагчы, а другому першую дапамогу аказваў урач выратавальнай службы.

Следча-аператыўная група УСК, дзейнасць якой у дзень трагедыі каардынаваў старшыня УСК па Магілёўскай вобласці Андрэй Ліс, правяла агляд мясцовасці, быў задзейнічаны эксперт па будаўніцтве.

— У рамках крымінальнай справы будзе назначаны шэраг экспертыз, у тым ліку будаўнічая, накont стану дома, колькі часу ён у такім выглядзе знаходзіцца, — удакладняе Аксана Салянюк. — Затрыманы індывідуальны прадпрымальнік, магілёўчанін 1970 года нараджэння, якому належыць даўгабуд. У адносінах да яго распачата крымінальная справа па артыкуле 144 — Прычыненне смерці па неасцярожнасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ХЛОПЧЫК, ЯКІ ТАНУЎ, УЖО ДЫХАЕ САМ

**Стан 9-гадовага хлопчыка, які 28 кастрычніка ледзьве не патануў у сталіцы ў Свіслачы, але быў выратаваны 15-гадовым Віталем Цітовым, паляпшаецца. Пра гэта паведаміла кіраўніцтва другой гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы Мінска, дзе знаходзіцца пацярпелы.**

Дзіця знялі з апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, хлопчык сам дыхае, сэрцабіцце ў яго ў парадку. Нагадаем, што адразу пасля здарэння відавочцы перадалі хлопчыка медыкам без дыхання і сэрцабіцця. Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі здолела запусціць сэрца дзіцяці, пасля яго падключылі да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, пацыент знаходзіўся ў стане медыкаментознага сну. Стан хлопчыка пэўны час заставаўся стабільна цяжкі. Даваць нейкія прагнозы спецыялісты пакуль не спяшаюцца. Але робяць усё магчымае, што неабходна ў такіх сітуацыях.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ...Спецыяліст па доме ці яго кіраўнік?



**Паводле нямецкіх стандартаў, хаус-майстар павінен рабіць вялікую колькасць работ. А згодна з нашымі законамі гэта ж мусяць рабіць 5—6 чалавек.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Ён можа ліквідаваць дробныя непаладкі і паведаміць, што патрэбна зрабіць яшчэ, — растлумачыла **Кацярына ГАРБАЧОВА, дырэктар установы дадатковай адукацыі дарослых «Дзяржаўны цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў «Жылкам»:**

— Калі разглядаць паняцце «хаус-майстар» у тым выглядзе, у якім яно прыйшло да нас з Германіі, то гэты спецыяліст — майстар па доме. Аднак у нас гэта менавіта рабочы па комплексным абслугоўванні дамоў і будынкаў. За ім замацаваны шэраг дамоў, і яго зона адказнасці і пералік абавязкаў адлюстраваны ў тэхналагічнай карце, распрацаванай РУП «Інстытут «Белжылпраект» Мінжылкамгаса. Яго абавязак — менавіта сачыць за станам жылля, каб усё у час замянялася і дасканала функцыянавала. У залежнасці ад года пабудовы дома, яго серыйнасці, ад таго, ці ўнесены будынак у чаргу на капрамонт, і залежыць спецыфіка яго работы.

Хаус-майстар можа памяняць лямпачку, але ніхто не патрабуе ад яго лазіць у электрашчыток, мяняць праводку ці выконваць іншыя складаныя работы па электрабяспецы: для гэтага ёсць спецыялісты профільныя. Калі пацёк кран, хаус-майстар можа спыніць цечу, але рамантаваць кран павінен сантэхнік. У задачу такога рабочага па доме ўваходзіць ачыстка даху і двара ад наледзі і снегу, умацаванне ганкаў, казыркоў над уваходамі ў пад'езды, агароджаў балконаў і іншае. Ён таксама можа замяніць шкло ў пад'ездзе ці выканаць невялікую афарбоўку.

## Адзін замест пяці

Сутнасць працы хаус-майстроў у Германіі ў тым, што гэты спецыяліст з'яўляецца правай рукой кіраўніка нерухомасцю (на іх дваіх прыходзіцца да 500 кватэр). Спажыўцу няма патрэбы выходзіць на ўзровень кіраўніка, бо ён напрамую кантактуе з хаус-майстрам, расказаў **Генадзь КАЛЁНАЎ, выканаўчы дырэктар Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці ў Беларусі (МАМН),** і растлумачыў, чаму нашы хаус-майстры не могуць працаваць на ўсе сто:

— Тое, што практыка існавання хаус-майстроў для звычайных спажыўцоў у Беларусі запатрабаваная і карысная, разумеюць на ўсіх узроўнях. Праўда, патэнцыял самой ідэі рэалізаваны ў Беларусі працэнтаў на 30, і гэта ўжо добра. Але ёсць магчымасці для ўдасканалення. Простымі арганізацыйнымі мерамі, правільна карыстаючыся такім інструментам, як хаус-майстар, можна дасягнуць значна больших вынікаў. Аднак гэтаму перашкаджаюць правілы, якія былі ўстаноўлены раней. Паводле нямецкіх стандартаў, хаус-майстар павінен выконваць вялікую колькасць работ. А згодна з нашымі законамі гэта ж мусяць рабіць 5—6 чалавек, і пры ўсім жаданні кіраўнікі дзяржарганізацый ЖКГ не могуць парушыць працоўны кодэкс і карыстацца патэнцыялам хаус-майстра ў поўнай меры.

Сапраўды, раней асобныя спецыялісты — маляры, цесляры, сантэхнікі, электрыкі, страхары — займаліся кожны сваёй справай. Цяпер такія дробныя работы выконвае адзін хаус-майстар.

— Хаус-майстар па вялікім рахунку не займаецца ліквідацыяй вынікаў аварый, яго задача хутчэй прафілактычная — не дапусціць узнікнення гэтых аварый. Калі ўсё ж нешта здарыцца, хаус-майстар павінен аператыўна адрэагаваць, аказаць першую кваліфікаваную дапамогу. Пры гэтым ніхто не выключаў з сістэмы ЖКГ электрыкаў, сантэхнікаў, цесляроў і іншых спецыялістаў, што павінны мець спецыяльны допуск для правядзення работ. Калі спатрэбіцца, яны выканаюць сваю частку, — падкрэсліла Кацярына Гарбачова.

## З прафесійнай «корачкай»

Дагэтуль хаус-майстраў рыхтавалі шляхам перападрыхтоўкі ўжо гатовых спецыялістаў, якія працавалі па пэўных рабочых спецыяльнасцях. За 2—3 месяцы яны атрымлівалі дадатковыя навыкі. З 2013 года такім чынам толькі ў Жылкаме перападрыхтавана каля 1200 чалавек. У 2019 годзе ў Мінску адбудзецца першы выпуск спецыялістаў, якія рыхтуюць па спецыяльнасці «рабочы па комплексным абслугоўванні і рамонце будынкаў».

— Гэта будзе комплексная прафесія рабочай спецыяльнасці, — падкрэсліла дырэктар установы дадатковай адукацыі. — Навучэнцы рыхтуюцца на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай трохгадовай адукацыі пасля 9-га класа. Існуе прафесійна-тэхнічны стандарт, які датычыцца адпаведных установ адукацыі. На нас ён не распаўсюджваецца, хоць мы з улікам гэтага стандарту ў межах свайго навучальнага працэсу карыстаемся некаторымі нормамі адносна фармулёвак і нормаў заканадаўства.

Генадзь Калёнаў упэўнены: адпаведную адукацыю, раз яе павінны набываць хаус-майстры, павінна мець і вышэйшае кіраўніцтва, каб лепш разумець, што патрабаваць ад комплекснага рабочага:

— Каб не наймаць спецыялізаваную арганізацыю і не плаціць вялікія грошы за выкананне работ, якія патрабуюць дакладнай спецыялізацыі, наймальнік у Германіі знаходзіць умелага чалавека без спецыяльнага навучання, гэта значыць хаус-майстра. Самога ж наймальніка, або кіраўніка нерухомасцю, рыхтуюць тры гады (прыкладна палова навучання — вучоба, палова — практыка). У нас усё наадварот: хаус-майстру патрэбна спецыяльная адукацыя, а яго кіраўніку такой не трэба. Гэта непаразуменне трэба ліквідаваць. Калі хаус-майстра вучаць у каледжы, то яго кіраўнік тым больш, незалежна ад таго, працуе ён у дзяржструктуры ці таварыстве ўласнікаў, па логіцы павінен атрымаць адпаведную адукацыю. Тады ён будзе дасканала разумець абавязкі хаус-майстра і зможа выкарыстоўваць яго з максімальнай карысцю для насельніцтва. Тады кіраўнік будзе падбіраць сабе такіх рабочых, якія будуць яго правай рукой і тварам арганізацыі.

## 5—10 хвілін у Германіі, 2—3 гадзіны — у нас

Столькі патрабуецца на ліквідацыю аварыйнай сітуацыі ў доме. Гэта адбываецца таму, што за мяжой хаус-майстар даступны кругласутачна і заўжды знаходзіцца на месцы, а айчынная «аварыйка» вымушана не толькі перапыніць праблему, але і адразу ліквідаваць яе. У выніку выезд на наступны тэрміновы аб'ект затрымліваецца. У гэтым адзін з асноўных недахопаў рэалізацыі сістэмы працы хаус-майстраў у нашай краіне, мяркуе Генадзь Калёнаў.

— Просты прыклад. Скажам, залівае кватэру. Наш чалавек звоніць у «аварыйку» ці службу 115. Каб прадухіліць заліванне і нанясенне шкоды, трэба перакрыць шаравы кран і ліквідаваць прычыну аварыі. Другі крок — пазбаўленне ад самой праблемы, рамонт. У Германіі хаус-майстар у любы час сутак устае і ідзе перакрываць кран, тым самым спыняючы нанясенне шкоды маёмасці жыхароў. Раніцай прыязджае рамонтная брыгада і займаецца рамонтам. У Беларусі пасля званка ў службу 115 заяўка па электроннай пошце накіроўваецца ў аварыйную службу. Брыгада з 2—3 чалавек накіроўваецца да месца аварыі. Аднак на прыбыццё ёй іншы раз патрэбна 3—4 гадзіны, пакольki заявак шмат, а служба вымушана не толькі перакрыць ваду, але і адрамантаваць трубу, перш чым ехаць на наступнае здарэнне.

## Хай яго навучаць!

Ці можна спрасціць праблему — зрабіць беларускага хаус-майстра даступным у любы час меншымі сродкамі? Каб жыхары маглі, напрыклад, замест званка ў аварыйную службу тэлефанаваць свайму комплекснаму рабочаму, каб ён тэрмінова «зняў» праблему? Вось што адказвае дырэктар МАМН:

— Можна проста цяпер, абсалютна нічога не мяняючы ў заканадаўстве, надзяліць хаус-майстроў, якія дасканала, значна лепш, чым аварыйная служба, ведаюць свае дамы, абавязкамі ў выпадку аварыі (у тым ліку і ў нерабочы час) тэрмінова ліквідаваць саму прычыну праблемы, напрыклад перакрыць той жа кран пры заліванні. У Германіі ўвогуле не існуе журналаў для рэгістрацыі часу з'яўлення і сыходу з працы работнікаў, ніхто не вядзе ўліку рабочага часу: галоўнае — вынік. Калі хаус-майстар працаваў у нядзелю на даверанім яму доме, то ў панядзелак ён спакойна едзе па сваіх справах, якімі меўся заняцца ў выхадны, але яго падмяняюць іншыя. Дзейнічае прынцып: калі чалавек эканоміць грошы жыхароў, тэрмінова перапыняючы прычыну псавання іх маёмасці падчас аварыі, то і яму трэба ствараць камфортныя ўмовы для працы, як праяўляюцца ў некаторых адступленнях ад рабочага графіка. За 30 гадоў там ніхто не расчараваўся ў падобнай рабоце інстытута хаус-майстроў.

Але ж адзін спецыяліст не можа працаваць кругласутачна ўвесь год. Значыць, тады хаус-майстроў павінна быць як мінімум два, каб адпавядаць такому рэжыму?

— Калі хаус-майстар захварэў ці пайшоў у адпачынак, кіраўнік нерухомасцю павінен прадугледзець магчымасць яго замены праз узаемадзеянне з іншымі майстрамі. Гэтаму кіраўніка таксама вучаць на адпаведных курсах, дзе 1,5 года — гэта тэорыя, і 1,5 — практыка. У выніку атрымліваецца спецыяліст, які ведае, што рабіць, і ўмее прымаць правільныя рашэнні, — растлумачыў Генадзь Калёнаў.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Падзея

# ЗАЛІСТАПАДЗІЛА!

## Сёння разбітая аб штатыў талерка абвесціць адкрыццё XXIV кінафестывалю «Лістапад»

**Любімая кінападзея года кінафестываль «Лістапад» сёлета адсылае да ісціны, любові і прыгажосці — у прамым сэнсе да індыйскага фільма «Satyam Shivam Sundaram: Love Sublime» Раджа Капура. Вы б толькі на гэта паглядзелі: Шашы Капур, адкрытыя сары, рухі сцёгнамі, салодкія ілюзіі, віхурныя страсці і тонкая, нават элегантная эротыка. Тое ж, у сэнсе, ісціну, любоў і прыгажосць, трэба паспрабаваць адшукаць у багатай праграме «Лістапада», якая сёлета ўключае 165 фільмаў з 55 краін. Ужо сёння, 3 лістапада, кінафестываль пакажа першыя стужкі і ў кінатэатры «Масква» правядзе цырымонію адкрыцця з разбіццём аб штатыў талеркі і паказам фільма «Арытмія» Барыса Хлебнікава.**

Сёлетні фестываль — гэта шэсць конкурсаў, у якія ўваходзяць 94 фільмы, пазаконкурсныя праграмы ігравога і дакументальнага кіно, індустрыяльная платформа, сустрэчы з аўтарамі. Гэта Міхаэль Ханеке, Франсуа Азон, Агнешка Холанд, Фаціх Акін, Бруно Дзюмон, пераможцы Канскага і Берлінскага кінафестываляў, асаблівы погляд на кіно постсавецкай прасторы, аўтары, якія хутка апынуцца ў авангардзе сусветнага кіно, і аўтары, што гэты свет ужо завявалі. Гэта буйное, важнае і стыльнае мерапрыемства, якое дае беларускай публіцы магчымасць убачыць на вялікім экране фільмы, якія яна, напэўна, ніколі без яго не ўбачыла б.

Пляцоўкамі сёлетняга «Лістапада» стануць кінатэатры Falcon Club Буцік Кіно, «Цэнтральны», «Мір», «Піянер», «Беларусь» і Музей гісторыі беларускага кіно. Конкурсныя праграмы, як заўсёды, будуць глядзець міжнародныя журы, сярод якіх на месцы былога Міжнароднага журы кінапрэсы з'явілася журы FIPRESCI — Міжнароднай федэрацыі кінакрытыкаў, у склад якой сёлета ўвайшлі дзесяць беларусаў. Адбыліся змены ва ўзнагародах — замест Золата, Серабра і Бронзы «Лістапада» сёлета кінафестываль будзе ўзнагароджваць Гран-пры, Прызам FIPRESCI і Прызам гледацкіх сімпатый.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на беларускае кіно, якое канцэнтруецца ва ўжо традыцыйным Нацыянальным конкурсе, а на XXIV кінафестывалі таксама аказваецца ў Асноўным конкурсе дакументальнага кіно (гэта фільм «Сяргей Плыткевіч. Чалавек з фотаапаратам» Вольгі Дашук) і ўпершыню ў конкурсе «Маладосць на маршы» (гэта карціна «Заўтра» Юліі Шатун).

Што датычыцца сённяшняга дня, ён можа прынесці нечаканыя эмоцыі праз прагляд новых фільмаў. У кінатэатры «Цэнтральны» будуць паказаны фільм адкрыцця «Лістапада» «Арытмія», расійскі альманах «20:17», вартая асобнай увагі карціна «След звера» Агнешкі Холанд і новы фільм Дэні Катэ, які летась узначальваў журы конкурсу «Маладосць на маршы», «Шаўковая скура». Пачне свае паказы і дакументальная праграма: у кінатэатры «Мір» можна будзе ўбачыць карціну Стывена Кантара «Танцоўшчык» і аргенцінскі фільм Радрыга Х. Віла «Танга ў Парыжы. Успаміны Астора П'яцолы» з праграмы «МузыкаДок», а таксама фільм грузінскага рэжысёра Левана Кагуашвілі «Новае жыццё Гагіты» і стужку «Нічэвуд», галоўным героем якой з'яўляецца папулярны афганскі акцёр.

Ужо заўтра гледачы і журы пачнуць глядзець конкурсныя праграмы, зацікаўленыя накіруюцца на мерапрыемствы Індустрыяльнай платформы, публіка пазнаёміцца з запрошанымі гасцямі і зможа задаць аўтарам свае пытанні пасля кінапрагляду. Але свята будзе не такое доўгае, як хацелася б: ужо 10 лістапада пасля насычаных фільмамі дзён мы даведаемся назвы пераможцаў і застанёмся з гэтым жыць. Да наступнага «Лістапада».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Літаратурныя вандроўкі

# ДАКРАНУЦЦА ДА ВЫТОКАЎ

## На малой радзіме Якуба Коласа — сведчанні і сакрэты яго таленту

**Сёння спаўняецца 135 гадоў з дня нараджэння нашага песняра Якуба Коласа. Цяжка пераацаніць той уклад, які ён унёс у развіццё беларускай літаратуры. Па-сапраўднаму народны паэт, ён стварыў цэлую галерэю герояў, што ўяўляюць сабой самыя яскравыя вобразы жыхароў вёскі, прадстаўнікоў інтэлігенцыі. У гэтыя памятныя дні карэспандэнты «Звязды» праехаліся па Стаўбцоўшчыне, малой радзіме песняра, каб паспрабаваць зразумець сакрэт таленту вялікага творцы.**

### АКІНЧЫЦЫ

Сядзіба ў Акінчыцах стала мемарыялам у 1982 годзе. Рупліўцамі стварэння музея былі Даніла Міцкевіч і Георгій Ткацэвіч. Апошні, шэсць гадоў праслужыўшы Коласу, пайшоў працаваць у іншы музей, а ў наш час з'яўляецца намеснікам старшыні Беларускага фонду культуры.

— Мне давялося рыхтаваць стагоддзе Якуба Коласа — я быў вельмі шчаслівы, — прыгадвае **Георгій ТКАЦЭВІЧ.** — І калі прыехалі госці ў родны куточак творцы, шчымела душа не толькі ў мяне. Я ствараў гэтае месца разам з добрымі людзьмі — адгукнуліся супрацоўнікі Акадэміі навук. Таксама далучыліся дарожнікі, мясцовыя будаўнікі, якія ўсю тэрыторыю давялі да ладу.



Сёння экскурсійны расповед у Акінчыцах можна пачуць з вуснаў **Соф'і Пятроўны МІЦКЕВІЧ.** Разам праходзім сені, мінаем камору, трапляем у святліцу. Жанчына па-добраму з вялікім задавальненнем і цеплынёй распавядае пра ўсе дэталі ўладкавання вясковай хаты:

— Вось калыска, раней яна называлася зыбачкай. У ёй мама калыхала будучага вялікага паэта. У Якуба Коласа было 12 родных братоў і сясцёр. Таму калыску гайдалі ўвесь час. Ну і не рукамі звычайна, а нагой, дзякуючы спецыяльнаму прыстасаванню. Бо рукі павінны былі быць свабоднымі для працы — прадзення нітак. Акурат вялікія клубы нітак можна ўбачыць у сядзібе...

«Жаночая работа — гэта вечныя турботы. То каля печы, то ў полі — амаль не зводзіцца ніколі», — так пісаў Колас пра сваю маму ў паэме «Новая зямля».

Усё ў гэтым месцы сведчыць пра зладжанае сямейнае жыццё. У музеі прадстаўлены побыт беларусаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя. У «залатым» фондзе — пранік, якім маці паэта, Ганна Юр'еўна, мыла бялізну, дзежка, у якой яна расчыняла цеста. Чаравікі дасталіся ад родных Коласа. Хусцінку-канапляначку здала ў экспазіцыю сястра песняра.

— Бацька паэта, як ажаніўся, займаўся тым, што ганяў плыты князя, — працягвае Соф'я Пятроўна. — Вось куфэрак, у якім Кальсці Міхал Міцкевіч захоўваў грошы, што атрымліваў за працу ў князя. Аднак калі сям'я пераехала з Ластка ў Альбуць, праз год жыцця на новым месцы ўся іх маёмасць згарэла. А куфэрак украў, як пасля высветлілася, жыхар Новага Свержаня. Золата ён забраў, а куфэрачак выкінуў... Пазней маці паэта стала захоўваць у ім прылады для ручной працы — нажніцы, іголкі, спецыяльныя прыстасаванні, каб змотваць ніткі, гузікі. А вось старажытная плоечка, каб падкручваць валасы, — у паэта ж было шмат сясцёр! Экспанаты для музея збіралі амаль 50 гадоў таму.

### АЛЬБУЦЬ

Наступны пункт нашай вандроўкі — мемарыяльная сядзіба «Альбуць», якая таксама з'яўляецца часткай музея «Мікалаеўшчына» (філіяла музея Якуба Коласа ў Мінску).

Тут сям'я Міцкевічаў жыла з 1890 па 1904 год. У гэтым месцы прайшлі дзіцячыя гады пісьменніка, кажуць, што менавіта тут ён напісаў свой першы верш. Адсюль ён паехаў на вучобу ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, сюды вяртаўся кожнае лета ўжо маладым настаўнікам. Менавіта Альбуць апісана ў яго паэме «Новая зямля» як Парэчча.

— Варта растлумачыць цікавую назву Альбуць, — распавядае Соф'я Міцкевіч. — Калісьці самымі багатымі людзьмі на гэтых землях былі князі Радзівілы — некаранаваныя каралі, — і яны мелі больш, чым хтосьці іншы, лясоў, у якіх ставілі леснічоўкі. 300 гадоў таму тут была нават леснічоўка, а будан! А дарога побач называлася Буданскай... Калісьці ў Радзівілаў пачаў выміраць род — дзеткі нараджаліся, але доўга не затрымліваліся на гэтай зямлі. Прычым жылі яны звычайна год, тры, пяць, сем, дзевяць — да трынаццаці гадоў мала хто дажываў. Ніхто не мог даўмецца, чаму так адбываецца?.. Князь Радзівіл пачаў шукаць раду, выпісваў розных дактароў з замежных краін. Але ніхто не мог знайсці прычыну. І вось князь знайшоў французскага доктара па прозвішчы Альба, яго запрасілі ў Нясвіж. Той праз нейкі час здолеў высветліць, што прычына ў шлюбах паміж блізкімі сваякамі. У гэту мясцовасць урач часам прыязджаў з князем на паляванне. Да таго ж ён быў інтэлектуалам, любіў пісаць алейнымі фарбамі. Ён намаляваў мясцовую рэчку, дубы, а знізу так і падпісаўся — «Альба». З таго часу гэта месца так і празвалі.



У 1990 годзе ў аднаўленай сядзібе была адкрыта літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя па матывах паэмы «Новая зямля». Выстава знаёміць з фотаздымкамі прататыпаў герояў паэмы, рукапісамі і выданнямі розных гадоў, а таксама з прадметамі сялянскага побыту.

Лагічным працягам экспазіцыі з'яўляецца выстава «Бортніцтва і рыбалоўства», якая размяшчаецца ў аднаўленым гумне. Тут можна ўбачыць рэдкія сёння прылады пчаляроў і рыбаловаў, якімі мог карыстацца і дзядзька Якуба Коласа — Антось, заўзяты аматар рыбалкі. Антось усё жыццё пражыў з сям'ёй Міцкевічаў і стаў адным з герояў паэмы «Новая зямля».

### СМОЛЬНЯ

У мемарыяльнай хаце ў Смольні выстаўлены рэчы сям'і Міцкевічаў, якімі карыстаўся і сам паэт.

У гэтай вёсцы ў жніўні 1912 года адбылася першая сустрэча Якуба Коласа і Янкі Купалы. Сюды прыязджаў пісьменнік вясной 1956 года, за некалькі месяцаў да смерці, каб паглядзець на Нёман і на краявіды, што знайшлі сваё адлюстраванне ў трылогіі «На ростанях» і ў паэме «Сымон-музыка».

Смольня стала мемарыяльнай сядзібай у 1967 годзе. Музейная плошча падзелена на дзве часткі: літаратурную і мемарыяльную. Сам дом стаў музеем толькі ў 1972 годзе, да 90-годдзя з дня нараджэння паэта.

Інтэр'ер мемарыяльнага дома аднаўлены па ўспамінах родных Коласа, аўтары праекта спрабавалі перадаць дух сям'і Міцкевічаў. На сядзібе аднаўлены хлеў і гумно, у галоўным сядзібным доме шмат этнаграфічных рэчаў.



**Соф'я Пятроўна МІЦКЕВІЧ ведае да драбніц, што звязвае Якуба Коласа са Смольняй.**

У пабудаваным двухпавярховым будынку размяшчаецца літаратурная экспазіцыя. Сюды перавезена частка інтэр'ера з музея Якуба Коласа ў Мінску (у гэтым доме паэт пражыў апошнія 11 гадоў свайго жыцця). У музеі знаходзяцца фатаграфіі, рэдкія выданні твораў песняра, лісты да сваякоў, каштоўныя рэчы. Тут жа зазвычай месцяцца і часовыя выставы — напрыклад, адметных вырабаў з воўны, зробленых сваякамі Коласа.

### ЛАСТОК

Ласток — месца, дзе Якуб Колас правёў свае раннія дзіцячыя гады. І тут знаходзіцца адзіны аўтэнтычны дом, дзе сапраўды жыла сям'я пісьменніка і ён сам — ва ўсіх астатніх месцах дамы былі перароблены наноў. Гэтаму дому сёння ўжо больш за 130 гадоў — вось ён, сапраўды сведка жыцця народнага песняра!

Побач з гістарычным домам аднаўлены гаспадарчыя пабудовы. У Ластку размясцілася літаратурная экспазіцыя па матывах паэмы «Сымон-музыка». Тут можна ўбачыць копіі рукапісаў паэмы, яе выданні розных гадоў, лісты, дакументы, фатаграфіі паэта 20-х гадоў XX стагоддзя.

***

Шлях да Коласа ў кожнага свой. Як і да беларускай літаратуры. Ніхто іншы за нас яго не пройдзе. Мы на свае вочы пабачылі радзіму вялікага паэта, дакрануліся да вытокаў яго творчасці. Тое самае раім зрабіць і вам.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

*Стаўбцоўскі раён*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ За кадрам

# ДЗЕ ЖЫВУЦЬ ТАЛЕНТЫ



**У наступную нядзелю, 5 лістапада, на канале АНТ пачнецца другі сезон рэспубліканскага тэлевізійнага конкурсу «Талент краіны». Пасля папярэдніх строгіх адбораў і праслухоўванняў з амаль 1000 ахвотных у праекце засталіся толькі 47 юных артыстаў і калектываў з розных рэгіёнаў Беларусі. Менавіта яны, падзеленыя на дзве ўзроставыя катэгорыі (5—10 гадоў і 11—15 гадоў), будуць спаборнічаць за ганаровае званне «Талента краіны», а таксама грант ад Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі.**



Гэтыя дзеці і падлеткі — сапраўды выдатныя асобы. Практычна ў кожнага з іх, нягледзячы на юны ўзрост, за плячыма не адзін конкурс, у тым ліку міжнароднага ўзроўню. Камусьці, магчыма, творчыя здольнасці дасталіся ў спадчыну ад бацькоў — прынамсці няцяжка правесці паралель паміж юнай артысткай Ціанай Нэльсан, якая выступае на конкурсе ў жанры харэаграфічнага мастацтва, і клубным дыджэем Джымі Нэльсанам, які ў свой час ірваў радыёпрыёмнікі песняй пра беларускіх дзяўчат. Іншыя ўдзельнікі ўмудрыліся прайсці праз шчыльнае сіта адбору цэлай сям'ёй — так, піяніст Багдан Бабіч выступае ў старэйшай узроставай групе ў інструментальным жанры, у той час як яго малодшая сястра Марыяна спаборнічае за выхад у фінал у намінацыі «вакальны жанр». Абое прызнаюцца: страшэнна перажываюць адно за аднаго, і ў той жа час — падтрымліваюць як мага лепш. Калі ж даведваешся, што Марыяна, як і мама, практычна невідушчая, але гэта не перашкаджае дзяўчыне займацца музыкай — спяваць, іграць на флейце і скрыпцы, выступаць разам з братам у шматлікіх конкурсах і перамагаць, — пачынаеш таксама перажываць, за таленавіты сямейны дуэт.

Папярэджваю: збіраючыся паглядзець тэлеверсію конкурсу, запасіцеся насоўкамі. Зусім не жарт — вельмі ўжо няпростыя жыццёвыя гісторыі ў многіх удзельнікаў «Талента краіны», вельмі кранальныя і шчымлівыя іхнія выступленні. Акрамя таго, у кожным выпуску праекта па добрай традыцыі выступаюць спецыяльныя госці — дзеці з унікальнымі здольнасцямі і сур'ёзнымі праблемамі са здароўем, а таксама выхаванцы дзіцячых дамоў і інтэрнатаў, для якіх выхад на вялікую сцэну — шанц знайсці сваю дарогу ў жыцці.

## Змяненні і дапаўненні

Гаворачы пра асаблівасці другога сезона «Талента краіны», кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў АНТ Анжаліна Мікульская адзначае больш высокі ўзровень яго ўдзельнікаў, а таксама большую маштабнасць самога конкурсу: «Мы выйшлі на вялікую сцэну Палаца Рэспублікі, што адначасова і прыемна, і адказна».

Агульная схема праекта не змянілася: канкурсанты ў кожнай узроставай катэгорыі спаборнічаюць па чатырох намінацыях: вакал, інструментальнае мастацтва, харэаграфія і арыгінальны жанр. Як і раней, прадстаўляць і суправаджаць юных артыстаў будуць вядучыя Іван Падрэз і Марына Грыцук, а ацэньваць — вядомыя дзеячы мастацтва на чале з рэктарам Акадэміі музыкі, старшынёй савета Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Кацярынай Дулавай. Але ёсць і пэўныя карэктывы.



Прынцыпова новым момантам у праекце стане прысутнасць на сцэне разам з удзельнікамі іх бацькоў, педагогаў і сяброў. Безумоўна, мы і раней здагадваліся, што ў кожнага таленавітага чалавека мусіць быць «група падтрымкі». Але адна справа здагадвацца, і зусім іншая — бачыць, як настаўнік у прамым сэнсе трымае кулакі за сваіх выхаванцаў, альбо мама бязгучна паўтарае за сынам словы песні...

Яшчэ адно новаўвядзенне датычыцца гледачоў, якія змогуць уплываць на ход конкурсу на ўсіх этапах. Пасля кожнага адборачнага канцэрта аднаго з тых, хто не пачуў запаветнага «так» ад журы, але запомніўся сваім талентам і харызмай, выратуе менавіта публіка. Якім чынам? Сачыце за эфірам — даведаецеся!

## Закуліссе без інтрыг

«Звязда» пабывала на здымках дзіцячага шоу — і пераканалася, што таленавітыя дзеці і падлеткі насамрэч «наша ўсё».

На вялікай сцэне Палаца Рэспублікі ўдзельнікі ніколькі не бянтэжацца — па-першае, да кожнага арганізатары падышлі з увагай і павагай, па-другое, публіка да іх прыйшла на рэдкасць чулая і добразычлівая, а па-трэцяе, у паветры зусім не адчуваецца подых канкурэнцыі. Не, канешне, кожны з выступоўцаў нацэлены на найлепшы, пажадана пераможны, вынік, але ў вялікай агульнай грымёрцы ўсе ўсміхаюцца і няма месца той нервовай мітусні, што суправаджае большасць конкурсаў.

— Перамагчы — не самая галоўная мэта, найперш цікава выступіць перад такой вялікай аўдыторыяй, — звонка шчабечуць сяброўкі з Гомеля — тры грацыі-гімнасткі з аматарскага цыркавога калектыву імя В. Абеля Таня Бурцава, Віка Музычэнка і Аліна Швед. — Так, будзе крыху крыўдна, калі не атрымаецца дайсці да фіналу, але ж тут сабраліся вельмі моцныя, таленавітыя артысты ў розных жанрах — нехта класна спявае, нехта танцуе, адзін хлопец выдатна вершы чытае... Мы паспелі добра пасябраваць з многімі ўдзельнікамі, а найлепш з Мікітам Кахновічам і яго ігуанай Машай.

— Хвалюецеся перад выступленнем?

— Канешне! Перажываем, каб у нумары на палотнах «Мігцэнне зорак» усё атрымалася. Але нас шмат хто падтрымлівае — сябры, мамы, педагогі і наш дырэктар цырка.

Удзельнікі танцавальнай студыі «Харошкі» Аляксей Белякоў і Настасся Іванова знешне падаюцца больш спакойнымі, але пры бліжэйшым разглядзе адчуваецца, што энергія ў іх бурліць і патрабуе выйсця — здаецца, Насця проста зараз гатовая выпырхнуць на сцэну і прадэманстраваць тры дзясяткі фуэтэ запар, як праслаўленая прыма-балерына Мацільда Кшэсінская. Яшчэ адзін прадстаўнік харэаграфічнага жанру Мікалай Смятанін, размінаючыся, выдае то «месячную паходку», то элементы хіп-хопа, а ў моманты хвалявання папраўляе адмысловы гальштук з Эйфелевай вежай — сімвал нябачнай падтрымкі ўсяго свайго класа з паглыбленым вывучэннем французскай. А непадалёк уваходзіць у вобраз прынцэсы Аўроры з балета «Спячая прыгажуня» мінчанка Ганна Іванская. «Я з цікавасцю глядзела праект яшчэ ў мінулым годзе, а сёлета педагогі прапанавалі таксама паспрабаваць свае сілы, — расказвае дзяўчына. — Для мяне гэта і новы сцэнічны вопыт, і шанц паказаць сябе і навучыцца нечаму ў іншых, і, безумоўна, імкненне да перамогі — навошта ісці на конкурс, калі не хочаш у ім перамагчы?»



Тым часам на сцэне — феерыя арыгінальнага жанру. У нумары патомнага артыста цырка Мікіты Кахновіча з Жодзіна задзейнічаны экзатычныя жывёлы, якія да таго ж, удакладняе бацька канкурсанта, не паддаюцца дрэсіроўцы.

— Атрымліваецца, я сяджу побач з дзікай ігуанай? — крыху насцярожана ўдакладняе Іван Падрэз.

— Дакладна так, і вы надта смела размахваеце перад ёй пальцамі. Яны ў вас лішнія?

— Не, у мяне наогул няма лішніх частак цела. Затое, дзякуючы вам я зразумеў, наколькі я ўдачлівы чалавек, — аджартоўваецца вядучы і адпраўляе дружалюбную на першы погляд жывёліну далей ад граху выступаць з юным дрэсіроўшчыкам.

## Наша «ўсё»

...Адны ўражваюць суддзяў і гледачоў філіграннай адточанасцю рухаў, другія — надзвычайным вакальным дыяпазонам, унікальнай памяццю, акцёрскім майстэрствам або нават... пясочнай анімацыяй. І практычна ўсе без выключэння — непадробнай шчырасцю. Калі канкурсанты прызнаюцца, што скачуць ад радасці — гэта не метафара, а рэальнасць. Таму не дзіва, што гледачы ў суседніх крэслах то захоплена войкаюць, то крадком выціраюць слёзы. А прыгожыя словы старшыні журы Кацярыны Дулавай: «Вы ўсе вельмі таленавітыя, вы — наш нацыянальны здабытак» гучаць без аніякага пафасу, проста як канстатацыя факта.

Нават не ўяўляю, якім чынам прафесійнае журы зробіць канчатковы выбар, калі пераможцам творчага конкурсу варты стаць кожны з іх — такіх розных і такіх адораных дзяцей і падлеткаў. Зразумела толькі адно: «Талент краіны — 2» абяцае быць відовішчным, захапляльным і драматычным. Як абяцаюць арганізатары, без прызоў і падарункаў, незалежна ад вынікаў, праект не пакіне ніводны юны артыст. Нас жа з вамі, шаноўныя тэлегледачы, чакае 7 выпускаў шоу, а вырашыцца яго інтрыга ў фінальным канцэрце 17 снежня.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*tselyashuk@zviazda.by*

■ Тэлесеткі

# ЯК ВЫ БАЧЫЦЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ»?

### Белтэлерадыёкампанія абвясціла адкрыты конкурс на найлепшую сімволіку дзіцячага шоу 2018 года

**У міжнароднага песеннага конкурсу «Еўрабачанне» ёсць традыцыя: штогод краіна-арганізатар выбірае пэўную тэму, якая аб'ядноўвае ўсіх удзельнікаў і гледачоў, і адлюстроўвае гэты інфармацыйны пасыл у адмысловай эмблеме і закліку-слогане. Нагадаем, дарослае «Еўрабачанне» сёлета прайшло ў Кіеве пад знакам нацыянальнага ўкраінскага абярэга — наміста і дэвізам «Celebrate Diversity» («Святкуем разнастайнасць»), а дзіцячае «Еўрабачанне—2017», якое адбудзецца 26 лістапада ў Тбілісі, сустрэне гасцей рознакаляровай усмешкай і заклікам «Shine Bright» («Ззяй ярка!»).**

Пра тое, што ў лістападзе 2018-га гаспадыняй дзіцячага шоу будзе Беларусь, аргкамітэт паведаміў зусім нядаўна, але падрыхтоўка да правядзення конкурсу ўжо ідзе. Як расказалі «Звяздзе» ў медыяхолдынгу, у пошуку арыгінальных ідэй і прапаноў, якія мусяць задаць настрой усяму конкурсу, вырашана было не абмяжоўвацца толькі меркаваннем прафесіяналаў. Прыдумаць свае праекты эмблемы, а таксама дэвіз (абавязкова на англійскай мове) можа кожны таленавіты мастак або дызайнер, зацікаўлены глядач ці адданы фанат «Еўрабачання».

Калі вы ўпэўнены, што менавіта ваш варыянт найбольш варты ўвасаблення — дасылайце свае прапановы не пазней за 15 лістапада звычайнай поштай — на адрас: вул. Макаёнка, 9, г. Мінск, 220807 з паметкай «Дзіцячае «Еўрабачанне — 2018», альбо электроннай — на junioreuro2018@gmail.com. Пераможца будзе прыняты ў крэатыўную каманду па падрыхтоўцы маштабнага песеннага форуму.

### Між іншым

Першы адзіны лагатып «Еўрабачанне» займела ў 2004 годзе, каб гледачы яго лепш пазнавалі. Надпіс Eurovision быў стылізаваны пад рукапісны, а на месцы «v» знаходзілася сэрца ў колерах сцяга прымаючай краіны. Праз дзесяць гадоў, акурат да 60-гадовага юбілею самога конкурсу, Еўрапейскі вяшчальны саюз крыху ўдасканаліў графічнае афармленне лагатыпа, але збольшага гэта былі касметычныя змены.

Адмысловыя тэмы і слоганы, штогод розныя, арганізатары прыдумляюць з 2002 года. Выключэннем стала толькі «Еўрабачанне-2009» у Маскве, якое афіцыйнага дэвіза не мела.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*tselyashuk@zviazda.by*

## Серада, 8 лістапада

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** Зона Х. (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След». (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Ніткі лёсу». (16+).**
**13.10** Дзіцячы доктар.
**13.45** Дзень у вялікім горадзе.
**14.45, 15.25 Серыял «Спявачка». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.55** Сфера інтарэсаў.
**0.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.15** Тэлебарометр.
**9.05, 17.10 Серыял «Помста». (16+).**
**11.05, 22.05** «Тата эможа?» (16+).
**11.55 Меладрама «Падарунак лёсу». (16+).**
**14.05, 20.30** «Бітва салонаў». (16+).
**15.10** Кіслы comment. (12+).
**15.15, 22.55 Серыял «Іх перабльталі ў раддоме». (16+).**
**16.15, 0.35** Нічога сабе ньюз.
**16.20, 23.50** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**19.20** «Паненка-сялянка». (16+).
**21.30** «Багіня шопінгу». (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрананак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бабенікі.
**8.05, 12.00, 19.55** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Доўгая дарога ў дзюнах». Маст. фільм. (12+).**
**9.30, 14.10 «Небяспечныя гастролі». Маст. фільм. (12+).**
**10.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці кінаапаратара, мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Барыса Аліфера.
**11.20, 17.35** «Легенды кіно». Леанід Быкаў. (12+).
**12.20** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Антаніна Сабодчыкава, Міхаіл Гулін.
**12.45** «Славянскі базар у Віцебску — 1995».
**13.45** «Музеі Беларусі».
**15.40, 21.05** «Маршалы Сталіна». Радзівон Маліноўскі. (12+).
**16.20, 21.45 «Маёр Віхар». Маст. фільм. 1-я серыя. (12+).**
**19.25** «Тэатр у дэталях». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь «Аіда».
**20.10** «Беларуская кухня». Пірог «Трухлявы пень».
**20.40** «Калыханка». (0+).
**23.00** «Песні пад гітару».
**23.10** «Вялікія мастакі». Эдгар Дэга. (12+).

### Беларусь 5

**8.00** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фіналу.
**9.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**10.25** Валейбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 3-і кваліфікацыйны раўнд. Першы матч. «Мінчанка» (Беларусь) — «Вакыфбанк» (Турцыя).
**12.30** Спорт-кадр.
**13.00** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Кіль» (Германія).
**14.35** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Металург» (Магнітагорск).
**16.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — БАТЭ (Барысаў).
**18.25** Козел пра футбол.
**18.45, 20.55** Спорт-цэнтр.
**18.55** Валейбол. Ліга чэмпіёнаў. Мужчыны. 3-і кваліфікацыйны раўнд. «Шахцёр» (Беларусь) — «Перуджа» (Італія).
**21.05** Слэм-данк.
**21.35** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Аляксандра Пахмутава. «Свеціць незнаёмая зорка» (12+).
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Хай кажуць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Адваротны адлік». «Крушэнне імперыі. Змова генералаў» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Троцкі» (16+).**
**23.00** «Сапраўдная гісторыя рускай рэвалюцыі» (16+).
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**9.35, 17.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**10.40 Фантастыка «Трансформеры-3. Цёмны бок Месяца». (12+).**
**13.15** «Усім па катку» (16+).
**13.50 Фантастыка «Трансформеры. Эпоха вынішчэння». (12+).**
**16.50** «Аўтапанарама» (12+).
**17.10** «Вадзіць па-руску» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак»(16+).
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.45 «Знахар». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00, 1.30 Серыял «Метад Фрэйда». (16+).**
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00, 13.15 Серыял «Шулер» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25** «Іншы свет». Як пазбавіцца ад кашмараў? (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**16.15, 17.10, 18.05 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**19.20 Серыял «Востраў непатрэбных людзей». (16+).**
**21.10 Серыял «Аддзел 44». (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Недарэчная зорка» (12+).**
**1.00** «Любімыя акцёры 2.0» (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00, 20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.10, 23.10 Серыял «Забароненае каханне». (16+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45** «За гранню». (16+).
**10.20, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік». (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**16.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45** «Спецыяльны выпуск». (16+).
**20.40 Серыял «Павуцінне». (16+).**
**23.20** «НЗ.by».
**23.45** «Вынікі дня».
**0.15 Серыял «Асноўная версія». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.55, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 16.00** Для дзяцей: «Адказвайка».
**7.30** Раніца на восьмым.
**10.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**11.00 Камедыя «Няхай жыве Цэзар» (16+).**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне» (16+).**
**14.25 Маст. фільм «Белае сонца пустыні» (16+).**
**16.05** «Мультпарад».
**17.00 Серыял «Дарагі доктар» (16+).**
**18.30 Серыял «Каханне і помста» (18+).**
**19.25** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**20.00 Серыял «Дзеці Арбата» (12+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Баявік «І цэлага свету мала» (16+).**
**23.15 Серыял «Турысты» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.00, 4.30** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.50** М/ф «Марын і яго сябры». (0+)
**8.50, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** «Сэрцы за каханне». (16+).
**10.00** «Проста кухня». (16+).
**10.40** Баявік «Глыбакаводны гарызонт». (16+).
**13.00, 19.00** Серыял «Івановы-Івановы». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Атэль «Элеон». (16+).
**16.45, 5.10** Серыял «Дзённік доктара Зайцавай». (16+).
**17.50, 23.30** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Камедыя «Прышэльцы». (12+).
**0.00** Серыял «Празорца». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35, 8.05, 20.30** «Правілы жыцця».
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Вольга Жызнёва.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.35, 22.45** «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
**9.25** Сусветныя скарбы.
**9.40** Галоўная роля.
**10.15, 18.30** «Назіральнік».
**11.10** XX стагоддзе. «Архангельскі мужык». Дак. фільм.
**12.20** «Геній».
**12.55** «Хто прыдумаў ксеракс?» Дак. фільм.
**13.35, 21.10** «Шалёныя мадэрністы». Дак. серыял.***
**14.30** Жывы Сусвет. «Пошукі жыцця». Дак. фільм.
**15.10, 1.40** Да юбілею Наталлі Гутман. І. Брамс. Канцэрт для скрыпкі і віяланчэлі.
**15.50** «Эрнан Картэс». Дак. фільм.
**16.00** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.
**16.30** «Пешшу...» Масква гімназічная.
**16.55** «Блізкае акружэнне Яўгена Князева».
**17.50** «Больш, чым каханне». Уладзіслаў Стржэльчык і Людміла Шувалава.
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Хто мы?» «1917-ы. Пераварот? Рэвалюцыя? Смута?»
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**22.05** «Абсалютны слых».
**23.55** Дакументальная камера. «Горад як здымачная пляцоўка. Серпухаў Вадзіма Абдрашытава».
**0.35** XX стагоддзе. Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна» з пісьменнікам Юльянам Сямёнавым». 1983 г.
**2.15** «Рына Зялёная — імя ўласнае». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Звычайная гісторыя». (16+).
**8.15, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 18.50, 20.15, 21.40, 23.00, 3.55, 5.45** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.55** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Бывай, 7 лістапада...» 2005 год (12+).
**12.50** Маст. фільм «Бумбараш». (16+).
**17.15** Тэлеспектакль «Цёмныя алеі». 1968 год (12+).
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Дзмітрый Язаў. 2007 год (12+).
**19.10** Маст. фільм «Гонкі па вертыкалі». 1-я серыя. (16+).
**0.00** «Вас запрашае Міхаіл Жванецкі». Творчы вечар у Канцэртнай студыі «Астанкіна». 1987 год (12+).
**1.25** Дак. фільм «Мае сучаснікі». (12+).
**2.25** «Вакол смеху». «Вялікі горад». 1980 год (12+).
**4.30** Маст. фільм «Я цябе ненавіджу». (16+).

### EuroSport 1

**4.30, 6.30, 8.30, 9.30** «Яго Вялікасць футбол».
**10.00, 22.00, 3.30** Watts.
**10.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**11.00** Аўтагонкі. Endurance.
**11.30** Лёгкая атлетыка. Марафон. Нью-Ёрк.
**13.00, 1.15** Снукер. International Championship. Фінал.
**15.00, 16.30** Алімпійскія гульні. «Зборы ў Патагоніі».
**17.00** Алімпійскія гульні. «Зала славы». Турын-2006. Хакей. Фінал.
**18.00** Алімпійскія гульні. «Зала славы». Сочы-2014. Хакей. Фінал.
**19.00** Тэніс. Выставачны матч. Глазга. Энздзі Марэй — Роджэр Федэрэр.
**21.00** Дрон-рэйсінг. DR1 Champions.
**23.00** Фігурнае катанне. Этап Гран-пры.

### Кінакамедыя

**1.35** Камедыя «Памятаю — не памятаю». (12+).
**3.05, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Лямпа намі». (16+).
**3.25** Камедыя «Будзь маім хлопцам на пяць хвілін». (16+).
**5.10** Камедыя «Як снег на галаву». (16+).
**6.55** Камедыя «Вялікае вяселле». (16+).
**8.35** Камедыя «Вялікі тата». (12+).
**10.15** Меладрама «Вяселле найлепшага сябра». (12+).
**12.15** Меладрама «Чужое вяселле». (16+).
**14.20, 15.10** Шоу «Камедыянты». (16+).
**16.00** Камедыя «Таксі-3». (16+).
**17.40** Камедыя «Без межаў». (12+).
**19.30** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму». (12+).
**21.35** Камедыя «Вялікі Стэн». (16+).
**23.40** Камедыя «Анёлы Чарлі». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.50** «Доктар І...» (16+).
**8.20** «Трэндзі» (16+).
**8.50, 19.00, 3.05** «Каралёк — птушачка пеўчая». Серыял (16+).
**10.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.05, 18.00** «Сляпая» (12+).
**13.05, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**14.10, 4.40** «Паралельны свет» (12+).
**15.05** «Паляўнічыя на прывіды» (16+).
**15.35** «Здзелка» (16+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**20.50** «Магазіна» (16+).
**21.50** «Рэвізора» (16+).
**22.55, 5.30** «Лінія абароны» (16+).
**23.30** «Легенда аб Шукальніку». Серыял (16+).
**0.15** «Сахара». Баявік (12+).
**2.10** «Гучныя справы» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Законы прывабнасці. (12+).
**8.00** Кіт. (16+).
**9.55** Як баязлівы Роберт Форд забіў Джэсі Джэймса. (16+).
**13.00** Піяніст. (16+).
**15.55** Дзікая рака. (12+).
**20.10** Троя. (16+).
**23.20** Дывергент. (12+).
**2.00** Найноўшы запавет. (18+).
**3.55** Адданы садоўнік. (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Адной левай. (12+).
**7.55** Ганна Карэніна. Гісторыя Вронскага. (12+).
**10.40** Ленін у Кастрычніку. (6+).
**12.40** Чалавек з ружжом. (6+).
**14.40** Ура! Канікулы! Заўтра раніцай. (12+).
**16.20, 4.20** Асколкі шчасця. Серыя 3—4. (12+).
**18.20** У стылі jazz. (16+).
**20.20** Бывайце, доктар Фрэйд! (12+).
**22.25** Барвовы колер снегападу. (16+).
**0.45** Як падняць мільён. Сповед Z@drota. (18+).
**2.35** Чыстае мастацтва. (16+).

### National Geographic

**6.00** Зрабі або памры. (12+).
**6.25, 7.35, 9.30, 17.10, 20.15, 22.35, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**6.50** Сапраўдны геній. (12+).
**8.00, 10.15, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.45** Ледзяная дарога. (12+).
**11.05** Шаша праз пекла. (12+).
**11.50** Аўта-SOS. (12+).
**12.35** Пачатак. (12+).
**13.20** Гульні розуму. (12+).
**15.40, 18.40, 1.35, 4.45** Антарктыка. (12+).
**16.25, 19.30, 2.25** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.00, 21.00, 0.50, 3.55** Інстынкт выжывання. (16+).
**21.45** Гады небяспечнага жыцця. (12+).
**23.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
**0.05** Служба бяспекі аэрапорта. (18+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.30, 21.30, 6.45** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 6.20** Харчовая фабрыка. (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Горная брыгада. (16+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00** Скарбы з каморкі. (12+).
**14.00, 5.30** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (16+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Голыя і напалоханыя XL. (16+).
**0.00** Мільёны Пабла Эскабара. (16+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.00** Самагоншчыкі. (18+).
**2.55** Мадэль для зборкі. (16+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** На гэтым тыдні не грэбуйце магчымасцю атрымаць кваліфікаваную дапамогу лекара або юрыста, гэта можа вам вельмі спатрэбіцца. У сераду адчуеце, што бясконцыя непаладкі і затрымкі ў рабоце прапаўзаюць чашу вашага цярпення, тым не менш паспрабуйце трымаць сябе ў руках: многія з перашкод, якія ўзніклі, на наступны дзень знікнуць самі сабой. Нечаканая інфармацыя, атрыманая ў чацвер, здольная змяніць ваша жыццё і планы на найбліжэйшую будучыню, магчыма, вы нават паспрабуеце пачаць жыццё з чыстага ліста.



**ЦЯЛЕЦ.** У гэтыя дні вам давядзецца браць на сябе адказнасць за прыняцце неабходных рашэнняў, якія паўплываюць на найбліжэйшую будучыню. Найлепшых вынікаў дасягнеце ў тым, да чаго будзе схільная ваша душа. У сераду пры дробных няўдачах не адчайвайцеся і старайцеся дамагчыся сваёй мэты. У пятніцу ў выніку саманадзейнасці рызыкуеце загнаць сябе ў кут. У выхадныя дні больш часу аддавайце сям'і і адпачынку.



**БЛІЗНЯТЫ.** У панядзелак актывізуйце сваю дзейнасць, начальства гэта заўважыць і ацэніць, вам прапануюць выгадную падпрацоўку. Паспрабуйце не зрываць сваё раздражненне на блізкіх людзях, будзьце больш памяркоўныя, і ўсё патроху ўтрасецца. У выхадныя вы здолееце парадаваць каханага чалавека, выканаўшы яго даўнюю мару. Вас чакае прыемны вечар удваіх.



**РАК.** На гэтым тыдні многія даўнія праблемы вырашацца зусім нечаканым чынам. Можаце разлічваць на паразуменне ў зносінах з людзьмі, якія вас акружаюць, а таксама на ўласную павышаную інтэлектуальную актыўнасць і дзелавую хватку. Пачынаючы з чацвярга, верагодныя падарожжа або змена звыклай абстаноўкі. У суботу не выключаны любоўныя прыгоды, вам вельмі спатрэбіцца цвярозы розум.



**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні работа не запатрабуе залішняга напружання. На ваш кар'ерны рост можа станоўча паўплываць чалавек, які даўно працуе побач, так што дарма пазбягаеце больш цеснага супрацоўніцтва з ім. Панядзелак — спрыяльны дзень для самаадукацыі, наведвання лекцый і майстар-класаў. У сераду чакайце выгадных знаёмстваў з замежнымі калегамі і камерцыйных прапаноў, якія лепш не адхіляць. У нядзелю вам, хутчэй за ўсё, давядзецца прыйсці на дапамогу камусьці са сваякоў.



**ДЗЕВА.** Работа можа запатрабаваць дадатковых намаганняў, таму лепш адразу вырашыць для сябе, з якім яе аб'ёмам вы можаце рэальна справіцца, і ні ў якім разе не згаджацца на павелічэнне гэтага ліміту. Не засяроджвайцеся на дробных задачах, а ўдзяліце ўвагу галоўнаму і маштабнаму. Не шкадуйце часу і сіл на праверку надзейнасці новых партнёраў, толькі тады ёсць сэнс пачынаць з імі сумесную дзейнасць. У вачах начальства варта быць як мага больш непрыкметным і сціплым.




## ШЫЛА Ў МЯШКУ НЕ СХАВАЕШ

Тыя з мужчын, хто жыў у Савецкім Саюзе, напэўна ж, помняць сваю службу ў войску — у легендарнай Савецкай Арміі ці Ваенна-Марскім Флоце. Юнакоў у іх прызывалі з усіх куткоў вялікай краіны, з усіх рэспублік.

Вось і Валерыку, майму аднагодку (ці не таму, што яму ўсе лужы па калена былі?), выпала апынуцца ў славутым Кранштаце, закрытым горадзе-порце, дзе на рэйдзе стаялі ваенныя караблі, а па набярэжнай гулялі сапраўдныя адміралы (гэта зараз трапіць туды можа любы турыст, а на той час — бронь божа).

...Пачатак службы выдаўся для хлопца досыць напружаны: каранцін, воінская прысяга, бавявая і палітычная падрыхтоўка. А паколькі ваенны флот меў даўнюю гісторыю і такія ж традыцыі, навічкі з цікавасцю слухалі пра спецыфіку марской службы з часоў Пятра І, запаміналі (ды каб і хацеў, не забудзеш), што тады перад абедам, напрыклад, абавязкова налівалі чарку, што не ганебным для матросаў лічылася наведванне розных шынкоў і нават так званае злоўжыванне. (Што цікава, калі пасля яго п'яны ляжаў галавой да карабля, то лічылася, што небарака хацеў трапіць на службу, але не змог. Таму яго заносілі на карабель і нават не каралі. Калі ж валяўся нагамі — да вады, да судна — ганьба: ледзь не ў дэзерцірстве маглі абвінаваціць...)

Факт: не службай адзінай жылі маракі-папярэднікі!

Умелі адпачываць і сябры Валеры. Ва ўсякім разе, на другім годзе службы (з трох) у іх таксама ўжо былі звальненні на бераг. Хлопцы гулялі па горадзе, ласаваліся марожаным, па даўняй завядзёнцы трымалі курс на Якарную плошчу. Там быў помнік знакамітаму контрадміралу Макараву, там узвышаўся велічны Марскі сабор і размяшчаўся матроскі базавы клуб, дзе апроч іншага ладзіліся танцы. А значыць, можна было знаёміцца з дзяўчатамі, прызначаць спатканні...

Дзеля аднаго з іх наш Валерык і наважыўся пайсці ў «самаволку». Удваіх з сябруком яны адзеліся ва ўсё цывільнае і, прашмыгнуўшы каля вахты, сышлі на бераг.

Пачувалі сябе як у бога за пячыма, бо свабода ж, вольніца...

Але раптам — адкуль ні вазьміся — патруль.

— Вайскоўцы? — строга пытае, спыніўшы.

Хлопцы ў струнку, навыцяжку:

— Ніяк не!

(Яшчэ і пятамі красовак прыстукнулі).

— У камендатуру!

...Што ні кажы, строгае было пакаранне, але ж першае і апошняе, бо далейшую службу гэтыя матросы неслі годна: наш бравы Валерык ва ўсякім разе выйшаў на «дзембель» старшыной і выдатнікам ВМФ. А галоўнае — поруч з нявестай, якая дачакалася хлопца... Не на тое спатканне, дык на іншае.

**Таццяна Раманава,**
*г. Наваполацк.*

## НЕ ВЕДАЮЧЫ БРОДУ...

У тую ранічку пасля начной змены да мяне падышла каляжанка і паклікала ў грыбы.

Я трохі падумала і згадзілася: ну чаму б і не, калі муж дома (яму на працу ў другую змену, значыць, дзяцей дагледзіць), а лес амаль побач з заводам. Да таго ж Галя запрашае, значыць, мясціны грыбныя ведае...

На двары быў кастрычнік. Надвор'е цяплом не песціла, а тут яшчэ і дожджык на галовы закапаў. Але ж грыбы, як выглядала, недзе ёсць...

Мы з Галяй знайшлі дзве кучкі апенек, пахадзілі яшчэ і толькі тут зразумелі, што заблудзіліся. Горш за тое побач з намі прабег дзік, а вакол было не сказаць, каб балота, але ж месца мокрае, пад нагамі чулася вада. І добра Галіне — яна «мерала» яе ботамі, а вось я, у туфлях, магла хіба што скакаць — з купіны на купіну.

Ведаць бы толькі, куды?!

Не помню, колькі мы пакружылі па лесе, але ж нарэшце пачулі, што недзе лапоча трактар (мабыць, калгаснае поле арэ?). Мы тут жа кінуліся на гэты шум.

Вушы, дзякаваць богу, не падвялі: вось яно, поле, вось і доўгачаканая дарога! Але ж, як той казаў, дарма, што відаць, ды далёка дыбаць: на шляху ў нас была яшчэ адна перашкода — канава метры са тры шырынёй, запоўненая мутнай зялёнай вадой. Ні пачатку ў яе, ні канца, як здавалася. Праўда, паводдаль я заўважыла бервяно, якое магло паслужыць нам кладкай. Яно было старое і, падобна, гнілое, але ж мне так хацелася дамоў, што я рашуча пайшла наперад.

Вынік аказаўся сумны: бервяно пада мной зламалася, і я ледзь не па калені апынулася ў вадзе. Пакуль выбіралася, Галіна адшукала нейкі іншы пераход і ўжо там, на другім баку рова, мы з ёй памяняліся абуткам: я на босыя ногі ўсунула яе боты, яна — на сухія калготкі — мае мокрыя туфлі.

У такім выглядзе мы выйшлі на дарогу, дапляліся да горада, пад'ехалі на тралейбусе.

Факт, што, калі я падыходзіла да дома, туды ж са школы ўжо вярталася мая старэйшая дачушка. З радасным крыкам: «Мама, у буфет булачкі прывезлі!» — яна кінулася да мяне. Мабыць, думала, што зараз я схаджу і куплю тых булачак (бо ў іншыя дні я гэта рабіла...). У той жа — я прамовіла: «Пайшлі дамоў».

Там, знерваваўшыся, мяне чакалі муж (які, апроч іншага, спазняўся на працу) і наша маленькая дачушка.

...На працы Галіна нешта, відаць, расказала пра наш сумесны паход у грыбы, бо жанчыны з нас доўга смяяліся.

А маглі б парагатаць, калі б ведалі, як я, выходзячы з лесу, старалася схаваць пад полы паліто Галіны боты 40-га памеру, і як яна — кульгала па вуліцы ў маіх мокрых туфлях 38-га.

...Болей з гэтай жанчынай я ў грыбы не хадзіла. У іншыя мясцы, зрэшты, таксама.

**Таццяна Чэкед,**
*г. Гомель.*

## «САЛА МНОГА НЕ БРАЎ»

Выпадак, пра які хачу расказаць, адбыўся гадоў 17 таму, але і зараз ён успамінаецца з цёплай усмешкай.

Пасля заканчэння ўніверсітэта я працавала ў вясковай школе і, вядома ж, надзвычай ярка ўспрымала ўсе праявы свайго новага, дарослага жыцця. Ну вось, напрыклад, з вучнямі сёмага класа мы вывучалі апавяданне Віктара Карамазава «Дзяльба кабанчыка». Дзеці шчыра цікавіліся творам, шкадавалі маці, якая раздала дзецям, што жылі ў горадзе, усё мяса ды сала, а сабе ад таго свінчаці пакінула толькі хвост і вушы, асуджалі яе дачок (маўляў, ім бы толькі торбы паўней напхаць), ухвалялі ўчынак малодшага сына, які ў апошні момант вырашыў не ехаць у горад, а застацца ў бацькоўскай хаце.

Дома школьнікі павінны былі напісаць сачыненне. Тэмы — на выбар: «Трэба дома бываць часцей», «У вёску па сала» і «За што я асуджаю герояў апавядання».

На наступным уроку вучні зачытвалі свае творы: пісалі, у прыватнасці, што яны не здрадзяць роднай вёсцы і не будуць паводзіць сябе так, як «героі» апавядання.

Але найбольш мяне ўразіла адно сачыненне — даўжынёю... у два радкі. Для таго каб напісаць іх, сямікласнік увёў сябе дарослым, самастойным і як бы з той далёкай будучыні напісаў: «Я прыехаў у вёску да маці, накалоў ёй дроў, насасіў вады. Сала многа не браў».

Усё, больш — ні слова...

Не помню, якую адзнаку за гэты твор я паставіла. Але ж каму з калег пра яго ні расказвала, усе, дружна пасмяяўшыся, прызнавалі, што выхаваўчая мэта ўрока была дасягнута.

Цікава б толькі даведацца, як там мой вучань? У вёсцы жыве ці туды прыязджае?

І сала бярэ ці не?

**Ірына Матусевіч,**
*Дзяржынскі раён.*

## НЕПАМЫСНА БЕЛАРУСУ, ШТО Ў КАЙФ ІНДУСУ

...Калі на працы каляжанкі пачыналі «мыць косці» сваім мужам — маўляў, і такія яны і гэткія, — Марына амаль не слухала, бо яе Валодзя быў зусім не такі: з галавой чалавек, і, здавалася, што ніколі яе не страціць, але ж...

Чарніц у гэтым годзе ані не было — нават для сабе. Затое грыбоў...

Яны з мужам штодня шчыравалі. Спачатку лісічкі кашамі насілі: і марынавалі іх, і марозілі, нават здавалі, каб грошай зарабіць на вучобу дачцэ. А потым баравікі пайшлі. Дома і пагатоў не ўсядзець.

Праўда, нейкага дня (і як на тое ліха) у іх машына зламалася. Муж тады падаўся ў гараж даводзіць яе да ладу, а Марына паехала ў лес з суседзямі.

...Назад вярнулася стомленая, але ўсчасліваа. Зазірнула ў залу. Яе Валодзя там, як Буда, на падлозе сядзеў. Гэта ў яго новая забаўка: ёгай займаецца. Ну і няхай: чым бы дзіця ні цешылася... Марына і раней неназаляла яму, і зараз не стала: ціхенька прычыніла дзверы і пайшла на кухню.

На стале ўбачыла недапітую бутэльку гарэлкі і два кілішкі. Значыць, Валодзя некага частаваў.

Хацелася спытаць, каго, але ж яшчэ больш — хоць на паўгадзінкі — прылегчы, адпачыць.

У сон — нібы ў яму — увалілася.

І сніцца ёй, што ў радзільню трапіла, што крык вакол, але чамусьці... мужчынскі.

Вочы расплюшчыла — дык гэта ж Валодзя ў зале крычыць!

Яна куляй туды, а ён і сапраўды разрадзіцца (цьфу ты, распрастацца) не можа: заснуў, відаць, скруціўшыся ў нейкай позе, вось сутаргі схапілі.

Чым дапамагчы?

Марына лётам да суседзяў.

Тыя адразу ж да іх (і ўсёй сям'ёй): занеслі небараку ў свой джып, памчалі ў бальніцу.

...Добра, што доктар талковы быў: як бачыш, зразумеў, што да чаго. Укол зрабіў, у ванне з цёплай вадой «раскруціў» Валодзевы ногі, расцёр. А ўжо потым, калі палягчэла, і прыгаворваць стаў: маўляў, каб не знаў ты ёгі, не балелі б ногі.

А Валодзя, што цікава, якраз ёгай і лячыўся. Казаў, памагала...

Факт, што Марына цяпер ведае: мужчыны і сапраўды як дзеці. Іх без нагляду нельга пакідаць, бо такое можа зрабіцца, што каб і хацеў, не прыдумаеш.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*




■ Неасабісты суб'ектыў

## ШПІЛЬКІ НАЗАЎЖДЫ



### Як адно слова можа выратаваць ад лістападаўскай дэпрэсіі

У ранніх восеньскіх прыцемках, ды яшчэ пад надакучлівым дробным дажджом ехаць па дарозе, якая знаходзіцца ў стане актыўнай рэканструкцыі, — выпрабаванне і для кіроўцы, і для пасажыра. Углядаешся ў паказальнікі, якія выхопліваюць з цемры фары, а да Мінска яшчэ далёка, і, здаецца, будзеш ехаць бясконца насустрач лістападаўскай ночы. І самотна, і амаль безнадзейна, як бывае толькі ў гэтым нелюбімым многімі месяцы.

Раптам мільганула назва вёскі, якая падалася знаёмай. Шпількі. Адкуль жа я яе ведаю? Ну, канешне, гэта ж недзе на мяжы Лідскага і Шчучынскага раёнаў. Давялося ісці тут пешшу пад спякотным жнівеньскім сонцам, дабіраючыся з Малога Мажэйкава ў Вялікае.

УВОГУЛЕ гэта была авантура з авантур. У адным з чытацкіх допісаў знайшла цікавы факт: на хутары каля вёскі Вялікае Мажэйкава жыве чалавек, які калісьці ўпершыню ў краіне пачаў вырошчваць жэньшэнь у прыродных умовах. Патэлефанавала ў тамтэйшы сельсавет, даведалася, што дзядуля, дзякуй богу, жывы-здаровы, і праз гадзіну ўжо трэслася ў апошнім аўтобусе на Шчучын, мяркуючы там пераначаваць, каб раніцай накіравацца далей.

Але чэрці тузанулі выйсці на станцыі ў Лідзе і паглядзець у расклад. Аказалася, што аўтобус на Мажэйкава ідзе адтуль а шостай раніцы. Гатэль у Лідзе зусім блізка ад вакзала, чаго ехаць у той Шчучын, дзе дагэтуль ніколі не была? Карацей, задаволеная ўласнай кемлівасцю, я назаўтра раніцай рушыла ў пункт прызначэння з Лідскага аўтавакзала.

Прыехаць я прыехала, і даволі хутка, але, як вы, напэўна, ужо здагадаліся, зусім не туды. Гэта я зразумела, убачыўшы надпіс «Малое Мажэйкава» на ўездзе ў вёску. Самае лепшае, што разумны чалавек мог у гэтым выпадку зрабіць — вярнуцца на тым жа аўтобусе назад. Але з той жа авантурнай адчайнасцю рашыла: Вялікае павінна быць зусім недалёка ад Малога, дайду.

Спагадлівыя кабеты ў канторы мясцовага калгаса, куды зайшла пацікавіцца, як да Вялікага Мажэйкава дайсці, паглядзелі на мяне, як на дзівачку, і растлумачылі: патрэбная мне вёска знаходзіцца ў суседнім Шчучынскім раёне, да яе дванаццаць кіламетраў. Транспарт адсюль ніякі туды не ходзіць. Рашучасці трохі паменшала, але ж не вяртацца назад, не пачынаць усё спачатку. Жанчыны з канторы, з сумненнем хістаючы галовамі («Як жа ты, дзіця, па такой гарачыні так далёка пойдзеш?») падрабязна мне расказалі, як ісці, яшчэ і схему на паперы намалявалі...

ТОЙ шлях пад спякотным жнівеньскім сонцам (сіноптыкі ў той дзень абяцалі да трыццаці двух і не падманулі, смаліць пачало ўжо з раніцы) і сёння, праз шмат гадоў, застаецца адным з самых харошых, прыемных успамінаў. Высокае сіняе неба без адзінай аблачынкі, жоўта-залацістыя пожні абапал дарогі, машыны, якія пралятаюць міма па трасе, але ты нават не спрабуеш спыніць іх, бо табе хутка трэба будзе з трасы збочыць налева, і трэба быць уважлівым, каб не прапусціць патрэбны паварот. Адчуванне дзіўнай пранізлівай адзіноты — маленькі чалавек на вялікай дарозе пад бясконцым небам — і адначасова ўпэўненасці, што да мэты ўсё-ткі дойдзеш. Вёска са смешнай назвай Шпількі, дзе выкручвала са студні ваду і піла яе, сцюдзёную, ад якой паколвала ў скронях, проста з цяжкога, узятага ў металічныя абручы, вядра. Крамяныя чырвоныя яблыкі, якімі тут частавала мяне прывітлівая бабуля, у якой яшчэ раз перапытала, ці правільна іду...

Падарожжа тое скончылася ўдала. Да Батрацкага хутара я дабралася-такі (да яго ад Вялікага Мажэйкава было яшчэ кіламетры тры), з гаспадаром — надзвычай цікавым гаспадарлівым дзедам пагутарыла. Як расце жэньшэнь, праўда, не пабачыла: у той год была цёплая зіма, і карані паелі мышы (пэўна, нават пасля такога пачастунку на дваццаць гадоў). Назад вярнулася без прыгод — даехала да Шчучына, а там пашанцавала перасакочыць у аўтобус, які ішоў з Гродна на Мінск, дзе чакалі новыя клопаты, новыя пісьмы, новыя камандзіроўкі. Тады і не думалася зусім, што менавіта гэта падарожжа стане тым самым успамінам, які і праз дваццаць гадоў, калі прамільгне ў святле фар знаёмая смешная назва, намалюецца ва ўсіх драбнютkіх дэталях і расквеціць лістападаўскую дажджлівую самоту стракатымі фарбамі жніўня...

А лістапад — ну яго, той лістапад. Шэра, дождж, нават днём — прыцемкі, у галаву розныя думкі дурныя лезуць? Але ж, памятаеце, у класіка: «Кожны носіць сваё неба з сабой». Ёсць жа на гэтым небе сонца, нікуды яно не дзелася. Калі нават і зайшло на час за хмары — мы самі маем волю іх разагнаць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СПЕЦАВТОМАТИКА»

| Предмет торгов | Начальная цена | Размер задатка |
|---|---|---|
| **Лот №1.** Изолированное помещение (инв. №130/D-58582) – однокомнатная квартира, пл. 55,2 кв. м, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Ровецкая, 8-11 | 59 130,68 рублей | 1560,00 рублей |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10. УНП 201028245 BIC Банка BPSBBY2X |

**Аукцион состоится 15 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 14 ноября 2017 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС»

| Предмет торгов | Начальная цена | Размер задатка |
|---|---|---|
| **Лот №1.** Капитальное строение (инв. №100/С-86468) – склад минеральных удобрений, пл. 3093,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Катин Бор, д. 99Б/12 | 69000,00 рублей | 1560,00 рублей |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10. УНП 201028245 BIC Банка BPSBBY2X |

**Аукцион состоится 5 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 4 декабря 2017 г. до 17.00**

## Извещение о проведении 4 декабря 2017 года торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, место-нахождение, продаваемого имущества)** | Изолированное помещение транспортного назначения – гараж с инв. №500D-11638, площадь 45,8 кв.м, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Инженерная, 36/8-22 |
| **Начальная цена** | 9 720,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 900,00 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 4 декабря 2017 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 04.11.2017 по 29.11.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже доли (25%) Президентского спортивного клуба в уставном фонде ООО «ЕвроСтэпГрупп»

| | Начальная цена продажи доли, доллары США (с учетом НДС) | Задаток, доллары США | Шаг аукциона, доллары США |
|---|---|---|---|
| **Лот №1**. Доля Президентского спортивного клуба в уставном фонде ООО «ЕвроСтэпГрупп». Размер доли – 25%. Номинальная стоимость доли 1 707,60 бел. руб. | 3 000 000 | 20 000 | 50 000 |

ООО «ЕвроСтэпГрупп» Республика Беларусь, г. Минск, ул. Притыцкого, 156, офис 20. Основная деятельность – инвестиционная деятельность в строительстве. Размер уставного фонда – 56 920,00 бел. руб.

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней после подписания протокола о результатах аукциона.

Валюта торгов – доллар США.

Валюта платежа – белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на момент заключения договора купли-продажи.

Оплата стоимости, приобретенного на аукционе Объекта, производится полностью или частями по согласованному сторонами сделки графику платежей в срок, не превышающий 3 (трех) месяцев со дня подписания договора купли-продажи Объекта.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,3% (ноль целых три десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Валюта платежа – белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь на день подписания протокола о результатах аукциона.

Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 16.11.2017 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4**

Продавец: Президентский спортивный клуб, 220029, г. Минск, ул. Старовиленская, 4, тел. 8 (017) 334-45-13.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, каб. 7, тел. 8 (017) 306-00-57.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 14.11.2017 в 11.00.

